Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
12 КРАСАВІКА 2013 г. ПЯТНІЦА № 68 (27433) Кошт 1500 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## БРАЦТВА МОЦНЫХ ДУХАМ

*Грамадскаму аб'яднанню «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане»*

Дарагія таварышы! Сардэчна віншую вас з 20-годдзем з дня ўтварэння грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

З'яднанасць, шчырае жаданне дапамагчы сваім таварышам і родным тых, хто не вярнуўся з поля бою, паслужылі стымулам да стварэння арганізацыі. Вы сталі сапраўдным брацтвам моцных духам людзей, перанёсшы загартаваныя ў полымі вайны гонар і годнасць на мірную ніву.

За адносна невялікі прамежак часу Саюз набыў вялікі вопыт работы. Створаны ўстойлівыя традыцыі па захаванні памяці аб подзвігах воінаў-інтэрнацыяналістаў, падтрымцы сем'яў загінулых аднапалчан. Арганізацыя заваявала высокі аўтарытэт у сучасным беларускім грамадстве і адыгрывае значную ролю ў падтрыманні згоды і стабільнасці, патрыятычным выхаванні моладзі.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця, рэалізацыі вашых задум і ідэй для плённай працы на карысць Айчыны.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## РОСТ ЦЭН — ПАД КАНТРОЛЬ

**Аляксандр Лукашэнка абяцае ўзмацніць патрабаванне з урада і Нацбанка за рост цэн. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў 11 красавіка, прымаючы з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка Надзею Ермакову.**

Кіраўніку дзяржавы далажана аб сітуацыі на валютным рынку, у банкаўскай сферы. Былі закрануты таксама пытанні даступнасці крэдытаў для насельніцтва і прадпрыемстваў.

Прэзідэнт звярнуў увагу на няпростую фінансава-эканамічную сітуацыю ў свеце, што ў сваю чаргу аказвае ўплыў на дынаміку знешняга гандлю. «Асабліва гэта датычыцца нашых традыцыйных рынкаў. Крыху Расія прасела, ды і Еўрасаюз ліхаманіць. Таму даводзіцца шукаць новыя рынкі збыту для нашай прадукцыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У гэтых няпростых умовах Нацыянальны банк не проста ўтрымлівае пазіцыі, якія мы мелі ў лепшыя часы, але і дабаўляе».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў зніжэнне ўзроўню інфляцыі. Пры гэтым ён заўважыў, што ў асобных выпадках рост цэн быў звязаны з адміністрацыйнымі мерамі. «Гэта такі парог, які мы павінны былі пераадолець. Але далей я буду вельмі строга патрабаваць за інфляцыю, за рост цэн, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Сёння суб'екты гаспадарання маюць добры прыбытак, рэнтабельнасць, і актуальнасць у росце цэн адсутнічае, тым больш што абменны курс беларускага рубля знаходзіцца на добрым узроўні».

Аляксандр Лукашэнка даручыў Надзеі Ермаковай надаць дадатковую ўвагу пытанням інфляцыі, росту цэн. «У вас у руках адпаведныя рычагі, вы карыстаецеся імі, як належыць, але калі інфляцыя высокая, пра якое развіццё можна гаварыць?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, той факт, што па выніках першага квартала гэтага года прадпрыемствы і насельніцтва прадалі валюты больш, чым набылі, з'яўляецца добрым паказчыкам у няпростых знешнеэканамічных умовах.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, ураду і Нацбанку было даручана прааналізаваць сітуацыю ў эканоміцы Беларусі па выніках першага квартала, выявіўшы магчымыя негатыўныя тэндэнцыі і шляхі іх пераадолення.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што фінансаванне маючых адбыцца веснавых палявых работ не павінна адбіцца на збалансаваным росце эканомікі краіны. «Хачу папярэдзіць вас: як бы ні было цяжка, гэта не значыць, што мы павінны цяпер «развязваць мяшок» і ўкідваць вялізныя грошы на пасяўную або яшчэ штосьці. Усё павінна ісці ў штатным рэжыме. Эканоміка не павінна быць заложніцай пасяўной кампаніі. Гэта абавязкова», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Надзея Ермакова паведаміла кіраўніку дзяржавы аб тым, што на фінансавым рынку Беларусі цяпер складваецца стабільная сітуацыя. Яна падкрэсліла, што гэта вынік не толькі намаганняў Нацыянальнага банка, але і работы ўсёй эканомікі краіны ў цэлым. «Сітуацыя на валютным рынку спакойная, і з тых разлікаў, якія ёсць у эканоміцы, мы не бачым прычын для неспакою», — адзначыла кіраўнік Нацыянальнага банка.

Яна паведаміла, што апошнім часам адбыўся рост валютных паступленняў у краіну, павялічыліся аб'ёмы продажу валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы.

Кіраўнік Нацбанка таксама паведаміла аб паступовым зніжэнні працэнтных ставак па крэдытах у беларускіх рублях. Пры гэтым доля праблемных крэдытаў у банкаўскай сістэме не павялічваецца.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ 12 красавіка — Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі



Алег НАВІЦКІ:

## «Мару ўбачыць захады-світанкі ў Чэрвені, зямным захапіцца і родных абняць...»

**Мабыць, найбольш частым у маіх думках і размовах за апошнія паўтара года было — «не верыцца». І тычылася яно палёту ў космас ураджэнца беларускага Чэрвеня Алега Навіцкага. Бо дужа нерэальным і фантастычным усё гэта здавалася напачатку — што просты хлопец родам з правінцыйнага беларускага гарадка, з якім разам вучыліся, удзельнічалі ў шматлікіх пазакласных мерапрыемствах, дасягне, дзякуючы ўласным настойлівасці, упартасці, неверагоднай працаздольнасці і вернасці дзіцячай мары, зорных вышынь — у прамым сэнсе. Што ён узнімецца ў неба на самым сапраўдным касмічным караблі. І ўсё гэта станецца для нас, яго землякоў, такім пранізліва-кранальным, трывожным і радасным адначасова, што застанецца назаўсёды ў душы і сэрцы.**

**Так супала па часе, што і канчатковы разбор палёту экіпажа транспартнага пілатуемага карабля «Саюз ТМА-06М» пад камандаваннем Алега Навіцкага (Раскосмас), і ўшанаванне яго, а таксама бортінжынераў Яўгена Тарэлкіна (Раскосмас) і Кевіна Форда (НАСА) адбылося з розніцай у пару дзён менавіта напярэдадні Сусветнага дня авіяцыі і касманаўтыкі. Што, безумоўна, дадало мерапрыемству ўрачыстасці.**

**Да вашай увагі, шаноўныя сябры, — скайп-інтэрв'ю з Алегам Навіцкім, якое атрымалася правесці на пачатку красавіка.**

**— Алег, дужа хочацца зірнуць на падрыхтоўку і ўласна прызямленне спускальнай капсулы тваімі вачыма. Скажы, калі ласка, што ты адчуваў, калі даведаўся, што з-за ўмоў надвор'я яно перанесена на суткі?**

— Адчуваў невялікае незадавальненне, бо нам пра гэта паведамілі ўжо перад самой расстыкоўкай. Заставалася толькі зняць хутказдымныя заціскі паміж МКС і касмічным караблём. Наступным дзеяннем было б закрыццё люкаў. Таму крыху крыўдна стала, бо па бартавой дакументацыі мы цалкам рыхталіся да расстыкоўкі і спуску. І перажывалі не таму, што на Зямлю трапім пазней. Проста столькі падрыхтоўчых мерапрыемстваў правялі, а ў выніку ўсё давялося вяртаць на свае месцы.

СТАР. 8

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ШАГУН, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

***«Зараз мы разглядаем пытанне аб увядзенні ў краіне дэпазітнага збору за шклотару. Дэпазітны збор мае на ўвазе, што, купляючы тавар, спажывец плаціць пэўную суму за тару, якую затым можа вярнуць, здаўшы яе. У савецкія часы такі збор быў, аднак тады тара была зваротная, яе адпраўлялі на прадпрыемства і зноў выкарыстоўвалі. Сёння сітуацыя ўскладнілася, бо большасць прадпрыемстваў харчовай прамысловасці выкарыстоўваюць сваю, эксклюзіўную бутэльку. Гэта стварае праблемы са зборам зваротнай шматабаротнай тары. Дэпазітны збор прадугледжвае не толькі вяртанне бутэлькі вытворцу, але яе трансфармацыю ў шклабой і далейшае прымяненне для вырабу новай тары».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.04.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8620,00 | ▲ |
| Еўра | 11280,00 | ■ |
| Рас. руб. | 279,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1059,49 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +11° |
| Віцебск | + 4° |
| Гомель | + 6° |
| Гродна | + 6° |
| Магілёў | + 5° |
| Мінск | + 7° |

## ПУШЧА ЗНОЎ З ТЫТУЛАМ

**Кабінет міністраў Савета Еўропы прыняў рашэнне аб аднаўленні Еўрапейскага дыплома для нацыянальнага парку «Белавежская пушча». На мінулым тыдні ў Камянюках атрымалі ліст са Страсбурга з афіцыйным паведамленнем аб станоўчым вырашэнні пытання.**

Упершыню гэту адзнаку нацыянальны парк атрымаў у 1997 годзе, але праз 10 гадоў дзеянне дыплома было прыпынена. Адной з прычын санкцыі называлася адсутнасць плана кіравання тэрыторыяй. Як паведамляе афіцыйны сайт Белавежскай пушчы, Еўрапейскі дыплом прадоўжаны да 30 верасня 2018 года.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Парламенцкія сустрэчы

Аляксандр ЦАЦОХА:

## «РАЗГЛЯДАЕМ УСЕ ПРАПАНОВЫ. ШТО МАГЧЫМА, ПАСТАРАЕМСЯ ЎЛІЧЫЦЬ»



**У бліжэйшыя дні дэпутаты ніжняй палаты парламента будуць разглядаць законапраект аб фізічнай культуры і спорце, які выклікаў неадназначную рэакцыю ў спартыўных колах краіны. Яшчэ большы рэзананс атрымалі змены ў закон аб ахове здароўя, які паступіў у парламент у сакавіку. Абодва дакументы знаходзяцца ў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і моладзевай палітыцы. Напярэдадні чарговага пасяджэння другой сесіі журналіст «Звязды» сустрэлася са старшынёй Камісіі Аляксандрам ЦАЦОХАМ, каб распытаць пра наваўвядзенні ў гэтых законапраектах і не толькі.**

### КРЫТЫКА ДАПАМАГАЕ

**— Аляксандр Уладзіміравіч, праца над законапраектам аб фізічнай культуры і спорце праходзіла на фоне абмеркавання неабходнасці прыняцця кодэкса...**

— У нашай краіне даўно наспела патрэба прыняцця кодэкса аб фізічнай культуры і спорце. Кодэкс мае перавагі: ён больш падрабязна трактуе нормы і зводзіць у адно цэлае ўсе законы ў пэўнай сферы. Праект новага закона аб фізічнай культуры і спорце паступіў да нас ужо 3 студзеня, і перш чым пачаць працу над ім, мы сабралі нараду з удзелам кіраўнікоў спартыўных федэрацый, Міністэрства спорту і турызму, прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта, генеральнага сакратара Нацыянальнага алімпійскага камітэта, дэпутатаў і іншых зацікаўленых асоб. На гэтай нарадзе было вырашана, што, пакуль ідзе работа над праектам кодэкса, новы закон аб фізічнай культуры і спорце трэба ўсё ж прыняць, інакш гэтая сфера выпадзе з прававога поля, бо дзейны закон састарэў. А кодэкс будзе гатовы не раней, чым праз 2-2,5 года. Спорт — гэта візітная картка любой дзяржавы, і спартыўныя дасягненні ацэньваюцца як дасягненні палітычныя. Таму мы не можам чакаць. Новы закон стане пляцоўкай для распрацоўкі кодэкса аб фізічнай культуры і спорце.

СТАР. 2

## ДАДЗЕНЫ СТАРТ ЯРАВОЙ СЯЎБЕ

**Земляробы Гомельшчыны першымі ў краіне далі старт яравой сяўбе. Як паведамілі ў прэс-службе Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, у чацвер да сяўбы ранніх яравых збожжавых культур прыступілі ў саўгасе «Камуніст» Ельскага раёна. Тут пачалі сеяць авёс.**

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЭКС-КАМІСАР ЕС ПРАПАНАВАЎ ГЕРМАНІІ ЎВЕСЦІ СВАЮ ВАЛЮТУ

Былы камісар ЕС па ўнутраным рынку, галандзец Фрыц Балкестэйн прапанаваў крэдытаздольным краінам Еўрасаюза ўвесці ўласную валюту паралельна з еўра, перадаюць інфармагенцтвы. На думку Балкестэйна, фінансавыя праблемы Еўропы толькі пачынаюцца, краіны еўразоны перажываюць толькі пачатковы этап фінансавага крызісу. Аднак пры наяўнасці паралельнай валюты самыя моцныя краіны змогуць умацаваць сваё фінансавае становішча. Увесці паралельную валюту экс-камісар прапанаваў у першую чаргу Германіі і Нідэрландам, як самым крэдытаздольным краінам еўразоны. Пры гэтым эмітэнтам новай валюты павінен стаць Цэнтрабанк Германіі. Балкестэйн таксама падкрэсліў, што Францыя пакуль не зможа стаць членам новага валютнага саюза, паколькі краіна, якая раней была адным з лідараў ЕС, зараз «практычна банкрут». Паводле прагнозу былога еўрапейскага камісара, зона еўра ў хуткім часе разваліцца. У сувязі з гэтым ён заклікаў Нідэрланды выйсці з еўразоны як мага хутчэй.

### КАВА І ЦЫГАРЭТЫ ЗАСЦЕРАГАЮЦЬ АД ХВАРОБЫ ПАРКІНСОНА?



Хоць навукоўцы да гэтага часу дакладна не ўстанавілі, што правакуе развіццё паркінсанізму, адно можна сказаць дакладна: гэтае захворванне радзей развіваецца ў курцоў і аматараў кавы, перадае РІА «Навіны». «Кафеін з'яўляецца фактарам антырызыкі, што пацверджана ў выніку эпідэміялагічных даследаванняў. Але рэкамендаваць усім піць каву мы не можам. Што тычыцца «плюсоў» курэння, то гэта звязана з пэўным кампанентам тытунёвага дыму, пэўнымі механізмамі ўздзеяння на галаўны мозг», — канстатуе акадэмік Мікалай Яхно. Аднак лячыць паркінсанізм курэннем нельга. Па словах намесніка дырэктара НДІ неўралогіі РАМН, прафесара, урача-неўролага Сяргея Іларыёшкіна, частка хворых памірае раней за той узрост, калі ў іх пачынаецца хвароба Паркінсона менавіта з-за наступстваў курэння.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ГАРАДЫ, ДЗЕ ТУРЫСТУ РАДЫ



Стамбул заняў першае месца ў пяцёрцы гарадоў, якія найбольш прыцягваюць турыстаў. Ён папулярны не толькі ў еўрапейцаў, але і ў расіян. Сярод краін, жыхары якіх ставяцца да іншаземцаў найбольш ветліва і прыязна, на першае месца выйшла халодная Ісландыя.

У першую пяцёрку рэйтынгу гарадоў, складзеным кампаніяй European Consumers Choice, акрамя Стамбула, увайшлі Лісабон, Вена, Барселона і Амстэрдам.

Цікава, што самыя прыязныя людзі ў свеце жывуць у малюсенькай Ісландыі, якую называюць «краінай гейзераў і вулканаў». Гэта вынікае са справаздачы Сусветнага эканамічнага форуму. Ісландыя выйшла на першае месца ў спісе, складзеным на аснове крытэрыю ветлівасці насельніцтва краіны ў дачыненні да турыстаў.

Усяго ў «прыязным» спісе — 140 краін. Напрыклад, ЗША, на дзіва, патрапілі толькі на 102 месца, нягледзячы на тое, што найбольш частымі словамі ў краіне з'яўляецца фраза «Жадаю добрага дня!», якая вымаўляецца з шырокай усмешкай, адзначае The Daily Mail. А вось Вялікабрытанія, нягледзячы на знакамітую чапурыстасць англічан, абышла Злучаныя Штаты ў два разы і размясцілася на 55 месцы. Ірландыя выйшла на дзявятае месца — мабыць, дзякуючы агульнавядомай балбатлівасці ірландцаў, канадцы таксама вельмі дружалюбныя — іх краіна заняла 12-е месца.

У топ-10 найбольш прыязных краін увайшлі Ісландыя, Новая Зеландыя, Марока, Македонія, Аўстрыя, Сенегал, Партугалія, Боснія і Герцагавіна, Ірландыя і Буркіна-Фасо.

Дзесяццю краінамі, якія занялі апошнія месцы, у парадку змяншэння прыязнасці, сталі Манголія, Балгарыя, Славацкая Рэспубліка, Пакістан, Іран, Латвія, Кувейт, Расійская Федэрацыя, Венесуэла і Балівія.

КОРАТКА

Больш як 200 грамадскіх інспектараў далучацца да рэйдаў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі, якія накіраваны на выяўленне фактаў незаконнага рыбалоўства. Рэйды пройдуць падчас забароны на лоўлю рыбы, што дзейнічае ў Беларусі з 1 красавіка па 30 мая.

Мытныя плацяжы цяпер можна выплачваць праз сістэму «Разлік» не толькі наяўнымі ў касы банкаў, але ва ўстройствах самаабслугоўвання (інфакіёск, cash-in), а таксама выкарыстоўваючы інтэрнэт-банкінг, sms-банкінг, сістэмы электронных грошай.

Беларуска Алена Чычкан (вагавая катэгорыя да 58 кг) стала чэмпіёнкай Еўропы па цяжкай атлетыцы.

Выдатныя дзяржаўныя палітычныя дзеячы Расіі ў выглядзе васковых фігур на два месяцы «пасяляцца» ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. Сумесная з Дзяржаўным музеем гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць» выстава «Гістарычная мазаіка» адкрыецца ў Мінску 12 красавіка.



## КАБ ДЗЕЦІ ЗАЎСЁДЫ МАРЫЛІ ПРА НЕБА

**У Магілёўскім дзяржаўным абласным ліцэі № 5, які знаходзіцца ў горадзе Быхаве, у 2005 годзе адкрыўся музей 57-й марской ракетаноснай авіяцыйнай дывізіі. З 1946-га па 1991 год гарнізон гэтай дывізіі размяшчаўся якраз у межах горада над Дняпром. Музей створаны па ініцыятыве дырэктара навучальнай установы Віктара Радзькова пры падтрымцы педагагічнага калектыву і па просьбе ветэранаў-авіятараў.**

— Мы шануем памяць пра марскіх лётчыкаў. Гісторыя дывізіі з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця нашага горада, — кажа Віктар Міхайлавіч. — Не менш важным з'яўляецца патрыятычнае выхаванне моладзі. Трыццаць Герояў Савецкага Саюза звязалі свой лёс з гэтай дывізіяй — хіба не падстава для гонару? Вельмі хочацца, каб дзеці не пераставалі марыць пра неба, як марылі іх бацькі і дзяды.

Цяпер у музеі сабрана каля тысячы каштоўных экспанатаў і дакументаў, якія нагадваюць пра гераічны шлях славутай 57-й дывізіі.

**На фотаздымку:** дырэктар музея Віктар РАДЗЬКОЎ каля касцюма ВМВК — высотнага марскога выратавальнага камплекта, якімі карысталіся лётчыкі баявых самалётаў ТУ-22.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

# ЗАДАЧА НА ПЕРСПЕКТЫВУ

**Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся 11 красавіка з губернатарам Пензенскай вобласці Васілём Бачкаровым.**

Прэзідэнт прапанаваў больш актыўна выкарыстоўваць перавагі еўразійскай інтэграцыі для развіцця вытворчай кааперацыі Беларусі і расійскіх рэгіёнаў.

«Цвёрда перакананы ў тым, што ў сучасных умовах партнёрскія адносіны не пабудуеш толькі на нейкіх гандлёвых і тавараабменных аперацыях. Трэба ісці па шляху стварэння сумесных вытворчасцяў, што мы і робім са многімі расійскімі рэгіёнамі. Гэта асабліва актуальна ў святле тых спрыяльных умоў, якія ствараюцца ў рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Адным з найважнейшых напрамкаў узаемадзеяння ў сувязі з гэтым становіцца вытворчая кааперацыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, у кааперацыйных праектаў шмат перавааг. Яны забяспечваюць рост узаемнага гандлю, ствараюць рабочыя месцы, стымулююць выпуск канкурэнтаздольнай тэхнікі, павялічваюць падатковыя паступленні ў бюджэт.

Станоўчыя прыклады такога супрацоўніцтва ёсць і з Пензенскай вобласцю. У 2012 годзе ў гэтым рэгіёне створана зборачная вытворчасць беларускіх трактароў, прапрацоўваецца магчымасць сумеснай вытворчасці ліфтавага абсталявання. На думку Аляксандра Лукашэнкі, ёсць перспектывы для развіцця ўзаемадзеяння ў сельскай гаспадарцы ў галіне жывёлагадоўлі, раслінаводства, укаранення перадавых тэхналогій у вытворчасць і перапрацоўку сельгаспрадукцыі. «Мы гатовы да абмену вопытам і сумесных праектаў у гэтай сферы», — заявіў Прэзідэнт.

Беларусь можа таксама прапанаваць Пензенскай вобласці супрацоўніцтва ў транспартнай і будаўнічай галінах.

«Гэта толькі некалькі напрамкаў, па якіх мы можам развіваць наша ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва. Насамрэч магчымасцяў для плённай сумеснай работы значна больш», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу губернатар Васіль Бачкароў прапанаваў рэалізаваць шэраг сумесных праектаў у мэблевай вытворчасці, лёгкай прамысловасці і дарожным будаўніцтве.

Ён пацвердзіў зацікаўленасць Пензенскай вобласці ў развіцці вытворчай кааперацыі з Беларуссю. І такія праекты ўжо ёсць. Так, напрыклад, у Пензенскай вобласці створана і пачало работу прадпрыемства па зборцы ліфтаў, куды значная частка камплектуючых пастаўляецца з магілёўскага завода. Губернатар звярнуў увагу на высокую якасць магілёўскіх ліфтаў і адзначыў, што ў цэлым у рэгіёне 80 працэнтаў выкарыстоўваемых ліфтаў — магілёўскія. Ва ўмовах плануемага нарошчвання будаўніцтва жылля ў Пензенскай вобласці такое супрацоўніцтва бачыцца вельмі перспектыўным.

«У вас ёсць чаму павучыцца і ў плане дарожнага будаўніцтва — тое, што вы ўмееце рабіць лепш, чым наша дарожная арганізацыя ў Пензе. Гэта праблема не толькі Пензы, але і рэгіёнаў, якія знаходзяцца побач», — адзначыў Васіль Бачкароў. У сувязі з гэтым ён прапанаваў прапрацаваць магчымасці для супрацоўніцтва ў гэтай сферы, у тым ліку з удзелам зацікаўленых бізнес-колаў.

Васіль Бачкароў даў высокую ацэнку і ўзроўню развіцця сельскай гаспадаркі ў Беларусі як у плане стварэння сучасных рабочых месцаў, так і выкарыстання найноўшага абсталявання. «Тыя фермы, якія мы ўчора ўбачылі, гэта прыгожая вытворчасць, разлічаная на людзей з дастойнай адукацыяй і, вядома, на добры заработак. Мы бачылі абсталяванне, якое выпрацоўваецца ў тым ліку сумесна з нідэрландскімі прадпрыемствамі, і гэта абсталяванне збіраецца і часткова камплектуецца за кошт беларускай вытворчасці. Я аб гэтым марыў, а вы гэта зрабілі», — сказаў губернатар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе прапановы, агучаныя губернатарам Пензенскай вобласці, актуальныя для Беларусі. Усімі гэтымі напрамкамі — па развіцці швейнай, абутковай, гарбарнай вытворчасцяў — у Беларусі ўшчыльную займаюцца.

Прэзідэнт, падводзячы вынік размовы, адзначыў, што Беларусь гатова накіраваць у Пензенскую вобласць як спецыялістаў, так і наладзіць пастаўкі тэхнікі. Ён падкрэсліў, што гарантуе выкананне ўсіх дасягнутых дамоўленасцяў.

У сваю чаргу губернатар адзначыў, што будзе асабіста кантраляваць ход рэалізацыі двухбаковых праектаў.

Бакі прынялі рашэнне стварыць рабочую групу, якая будзе займацца больш цесна работай па ўсіх абазначаных перспектыўных напрамках супрацоўніцтва Беларусі і Пензенскай вобласці.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «РАЗГЛЯДАЕМ УСЕ ПРАПАНОВЫ...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

**— Калі вы плануеце выносіць законапраект на парламенцкую сесію?**

— Мы гатовы разглядаць яго ў першым чытанні ўжо 17 красавіка. Заўваг было шмат, але яны не мелі канцэптуальнага характару, таму мы выносім законапраект у аўтарскай рэдакцыі.

**— Якія асноўныя новаўвядзенні прапануюцца ў будучым законе?**

— Законапраект замацоўвае вельмі важны прынцып спалучэння дзяржаўнага і грамадскага рэгулявання ў сферы фізічнай культуры і спорту. У якасці арганізацый, якія будуць ажыццяўляць грамадскае рэгуляванне, вызначаны Нацыянальны алімпійскі камітэт, Паралімпійскі камітэт, арганізацыі, якія ўзначальваюць дэфлімпійскі (ад англійскага слова deaf «глухі» — **В.М.**) і спецыяльны алімпійскі рухі Беларусі, федэрацыі.

Упершыню на заканадаўчым узроўні падрабязна рэгламентаваны прававыя статусы Нацыянальнага алімпійскага камітэта, федэрацый. Замацавана ўваходжанне спартыўных дзіцяча-юнацкіх школ у адпаведныя спартыўныя клубы. Прапануецца замацаваць практыку фарміравання і функцыянавання цэнтраў фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў. Гэта вельмі важна для аднаўлення студэнцкага спорту, які ў нас знаходзіцца ў неналежным стане.

Рэгламентавана стварэнне гарадскіх і раённых фізкультурна-аздараўленчых цэнтраў і фізкультурна-спартыўных клубаў. Замацоўваецца палажэнне аб спартыўна-аздараўленчым лагеры. Упершыню ўводзіцца інстытут прызнання відаў спорту. Асаблівая ўвага ў законапраекце надаецца пытанням допінгу ў спорце, яго прадухілення і барацьбы з ім, допінг-кантролю. Гэта — калі коратка.

**— Як вы пракаментуеце выказванне ў прэсе некаторых спартыўных кіраўнікоў пра тое, што законапраект аб фізічнай культуры і спорце ўжо маральна састарэў? У прыватнасці, што ён не адлюстроўвае пытанні выдачы спартыўных пашпартоў, трансфераў, арэнды спартсменаў...**

— У законе немагчыма прапісаць усе нюансы і арганізацыйныя моманты. Пад яго ствараюцца падзаконныя акты — палажэнні, інструкцыі. Вось там і можна прапісаць усе гэтыя пазіцыі. Гэта больш датычыцца фінансавага боку справы. Тое, што законапраект крытыкуюць, — нармальна. Гэта дапаможа нам улічыць яго недахопы пры распрацоўцы кодэкса аб фізічнай культуры і спорце.

## ДЗЕЦІ НЕ ПАВІННЫ АДКАЗВАЦЬ ЗА БАЦЬКОЎ

**— Ці можна ўжо казаць пра тое, якім да першага чытання будзе прадстаўлены законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон па ахове здароўя?**

— Мы толькі пачалі над ім работу, таму рана казаць, у якім выглядзе ён будзе падрыхтаваны да першага чытання. Калі казаць агульна, дакумент рэгулюе прыярытэтныя накірункі прафілактычных мерапрыемстваў па ахове здароўя, замацоўвае новыя віды аказання медыцынскай дапамогі: высокатэхналагічная, палеатыўная і медыка-сацыяльная. Законапраект пашырае пералік умоў аказання медыцынскай дапамогі, уключаючы дзённы стацыянар і дапамогу, якая аказваецца па-за медыцынскай установай.

Асаблівую цікавасць грамадства выклікае артыкул, які датычыцца штучнага перарывання цяжарнасці. Мы атрымалі шмат лістоў. Разглядаем усе прапановы. Што магчыма, пастараемся ўлічыць. Кожны аўтар атрымае ад нас адказ з тлумачэннем, чаму мы пагадзіліся альбо не пагадзіліся з яго прапановай.

Яшчэ адзін артыкул, які выклікае спрэчкі, датычыцца вяртання дзяржаве выдаткаў на лячэнне, калі грамадзянін пашкодзіў свайму здароўю ў выніку алкагольнага або наркатычнага ап'янення. З аднаго боку, лагічна, каб чалавек адказваў за наступствы злоўжывання алкаголем альбо за ўжыванне наркотыкаў. Але блізкія не павінны з-за гэтага пакутаваць. Напэўна, трэба абраць нешта сярэдняе. Таму праца над гэтым артыкулам чакаецца няпростая.

**З аднаго боку, лагічна, каб чалавек адказваў за наступствы злоўжывання алкаголем альбо за ўжыванне наркотыкаў. Але блізкія не павінны з-за гэтага пакутаваць. Напэўна, трэба абраць нешта сярэдняе.**

Законапраект прадугледжвае новаўвядзенні і ў дачыненні да такога паняцця, як урачэбная тайна, каб пра медыцынскі дыягназ маглі пры неабходнасці даведацца страхавыя кампаніі і следчыя, а таксама ўдасканальвае палажэнне аб забеспячэнні лекавымі сродкамі грамадзян.

## ПІЛОТНЫ ПРАЕКТ І РЭКАМЕНДАЦЫІ СУСВЕТНАГА БАНКА

**— Нядаўна вы сустракаліся з прадстаўнікамі Сусветнага банка, якія распрацавалі другую частку аналітычнай справаздачы па дзяржаўных выдатках у нашай краіне — у прыватнасці, у сферы аховы здароўя. Рэкамендацыі Сусветнага банка будуць улічаны ў рабоце над законапраектам?**

— Я пакуль яшчэ не меў магчымасці азнаёміцца з гэтай справаздачай, аднак тое, што прадстаўнікі Сусветнага банка казалі на сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў, варта ўвагі. Больш за тое, у Магілёўскай вобласці ўжо ажыццяўляецца пілотны праект, які закліканы пацвердзіць слушнасць гэтых рэкамендацый. Эксперты Сусветнага банка заўважылі, што бюджэтныя грошы трэба ўкладаць у тыя ўстановы аховы здароўя, якія больш запатрабаваны ў насельніцтва. У нас жа сродкі падзелены ў залежнасці ад колькасці бальнічных ложкаў, і не важна: лечыцца нехта на гэтым ложку, альбо ён стаіць пусты. Разлікі рабіліся з улікам колькасці насельніцтва. Такім чынам, адны медыцынскія ўстановы атрымліваюць грошы за пустыя ложкі, а іншыя недаатрымліваюць.

Безумоўна, некаму зручна працаваць напаўсілы, аднак у выніку гэта адбіваецца на якасці медыцынскага абслугоўвання, а бюджэтныя грошы выдаткоўваюцца неэфектыўна. Пытанне ляжыць не ў сферы закона. Закон не забараняе рэструктурызацыю медыцынскіх устаноў.

Аналітычная справаздача Сусветнага банка для нас — гэта перш за ўсё магчымасць убачыць сітуацыю вачыма незалежнага назіральніка, які, да таго ж, улічвае сусветны вопыт. Пры гэтым трэба памятаць, што не ўсякі замежны вопыт нам падыходзіць. У такіх сферах, як ахова здароўя і адукацыя, нельга рабіць рэзкіх рухаў, інакш мы будзем падобныя да слана ў пасуднай лаўцы.

**— Над якімі яшчэ законапраектамі вы будзеце працаваць у бліжэйшы час?**

— У верасні мы павінны атрымаць законапраект аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у закон аб донарстве крыві і яе кампанентаў. Тут змены будуць датычыцца пашырэння гарантый донараў, якія здаюць кроў у выхадны дзень або падчас адпачынку.

## «МЫ НЕДАСТАТКОВА ВЫКАРЫСТОЎВАЕМ МАГЧЫМАСЦІ РАННЯГА ЎСЫНАЎЛЕННЯ»

**— У кампетэнцыі вашай Камісіі таксама і заканадаўства ў сферы сям'і. У сувязі з гэтым вось пра што хачу спытаць: у Расіі зараз шырока абмяркоўваюцца лёсы ўсыноўленых грамадзянамі ЗША дзяцей. А як ідуць справы з нашымі сіротамі, якія выхоўваюцца за мяжой? Наколькі Беларусь адсочвае гэтую сітуацыю?**

— Замежнае ўсынаўленне ў нас прыпынена больш як 10 гадоў. Цяпер усынаўляюць, як правіла, па-першае, італьянцы, па-другое, ужо паўналетніх. Такія сем'і даўно і добра ведаюць гэтых маладых людзей, бо штогод запрашалі іх на аздараўленне. Аднак лепш, каб нашы дзеці заставаліся ў нас. Бо насамрэч цалкам адсачыць сітуацыю ў іншай краіне немагчыма. Трагічныя выпадкі, якія зараз шырока абмяркоўваюцца ў расійскіх СМІ, сведчаць, што пра дрэнную сітуацыю з дзіцем службы апекі, на жаль, даведваюцца занадта позна.

**— Чаму, на ваш погляд, у Беларусі, нягледзячы на ўсе захады дзяржавы, дагэтуль у дзіцячых дамах застаецца вялікая колькасць сірот?**

— Менталітэт прыняццем закона не зменіш. На Каўказе няма дзіцячых дамоў, бо там моцныя сваяцкія сувязі, і, калі здараецца бяда, падключаюцца ўсе. Думаю, мы прыйдзем да таго, што інтэрнатных устаноў для сірот не будзе і ў нас. На мой погляд, мы недастаткова выкарыстоўваем магчымасці ўсынаўлення ў раннім узросце. Бо знайсці сям'ю для падлетка цяжка.

**— Ды не кожны падлетак і сам пажадае абмяжоўваць сваю інтэрнацкую свабоду...**

— Пра гэта і размова. Трэба прыкладаць больш намаганняў, каб дзіця было ўсыноўлена да 3 гадоў. Мы занадта доўга важдаемся з біялагічнымі бацькамі і губляем час. Маё меркаванне: калі чалавек прамяняў сваё дзіця на бутэльку, забірае ў яго апошні кавалак хлеба і вядзе амаральны лад жыцця, то лепш аддаць гэтае дзіця ў нармальную сям'ю, дзе ў яго будзе будучыня. Лічу, што да асоб, якія не жадаюць клапаціцца пра сваіх дзяцей, трэба ставіцца больш жорстка.

## МАЛАДЫ ЭЛЕКТАРАТ І СТАРЫ ЖЫЛЛЁВЫ ФОНД

**— Работа ў акрузе для вас не новая: вы былі старшынёй пастаяннай камісіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць пятага і дваццаць шостага склікання...**

— Больш за тое, мая акруга абласнога Савета ўваходзіла ў Віцебска-Кастрычніцкую акругу №20, дзе я балаціраваўся ў Палату прадстаўнікоў. Так што акругу ведаю добра: пешшу яе ўсю прайшоў, хаця яна не маленькая. У адрозненне ад іншых кандыдатаў, ужо не мог проста абяцаць нешта сваім выбаршчыкам, а павінен быў дакладаць пра тое, што за 6 гадоў дэпутацтва ў абласным Савеце зрабіў. Мне дапамагае, што і мяне ведаюць, бо як старшыня камісіі я часта выступаў у прэсе, перад працоўнымі калектывамі, ды і зроблена нямала.

**— Якія асаблівасці вашай акругі?**

— Гэта старая частка Віцебска, дзе знаходзіцца вялікая колькасць прамысловых прадпрыемстваў, медыцынскіх, вучэбных устаноў і студэнцкіх інтэрнатаў. Шмат моладзі. Гэта добра, бо моладзі ўласцівы максімалізм, яна не даруе непаслядоўнасці і слабасці. Мне пашанцавала, бо ўсё жыццё працую з моладдзю: 10 гадоў узначальваў кафедру ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце, не прыпыняў сувязі з гэтай ВНУ і потым, а з 1993 года і да абрання ў парламент кіраваў Віцебскім медыцынскім каледжам. Таму размаўляць з моладдзю не баюся, сам побач з ёй адчуваю сябе маладым.

Асноўныя праблемы акругі — стары жыллёвы фонд. Нам, нарэшце, удалося дабіцца зносу баракаў, вылучэння дадатковых сродкаў на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы гарадскіх паліклінік і бальніц, хуткага ўзвядзення сацыяльных аб'ектаў у новых мікрараёнах горада. Рашэнні гэтыя прымаліся выканаўчай уладай не без удзелу дэпутатаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ДАДЗЕНЫ СТАРТ ЯРАВОЙ СЯЎБЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

12 красавіка сяўба пачынаецца і ў Мазырскім раёне. На падрыхтаваныя пад сяўбу аўса ўчасткі выведуць тэхніку механізатары эксперыментальнай базы «Крынічная». Хутка да іх далучацца і іншыя сельгаспрадпрыемствы на поўдні вобласці, дзе ёсць палі з пясчанымі глебамі. Сёлета ранніх яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры на Гомельшчыне плануецца пасеяць на 146 тысячах гектараў. Агульная плошча пасеваў усіх яравых культур складзе амаль паўмільёна гектараў.

Дарэчы, прамысловыя прадпрыемствы Гомеля і буйных райцэнтраў вобласці на час пасяўной кампаніі накіруюць у гаспадаркі 145 кваліфікаваных механізатараў. Гэтае рашэнне, прынятае па ўзгадненні з органамі мясцовай улады, прадыктавана неабходнасцю дадаткова ўкамплектаваць кадрамі сельскагаспадарчыя прадпрыемствы з мэтай максімальнай загрузкі энерганасычаных трактароў пятага класа, якіх у вобласці налічваецца больш за 700 адзінак. Высокапрадукцыйная праца гэтых машын будзе вырашаць зыход сяўбы ва ўмовах, якія склаліся з-за позняй вясны. Акрамя таго, на дапамогу будзе адпраўлена 200 падрыхтаваных выпускнікоў і вучняў прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і каледжаў і каля 300 механізатараў, якія працуюць у гаспадарках на іншых пасадах. Усяго на палявых работах плануецца задзейнічаць больш за 6,6 тыс. чалавек. Зараз завяршаецца прапрацоўка пытанняў, звязаных з арганізацыяй абслугоўвання тэхнікі ў полі, арганізацыі гарачага харчавання і іншых сацыяльна-бытавых пытанняў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Футбол

# «РЭАЛ» І «БАРСЕЛОНА» ЗГУЛЯЮЦЬ У ПАЎФІНАЛЕ ЛІГІ ЧЭМПІЁНАЎ

**Па вялікім рахунку, кожны з чвэрцьфіналаў праходзіў у бескампраміснай барацьбе. Напэўна, толькі ў матчах нямецкай «Баварыі» і турынскага «Ювентуса» ўсё было неяк відавочна. Былы сапернік БАТЭ даволі ўпэўнена двойчы перайграў апанента з аднолькавым лікам 2:0.**

А вось дортмундская «Барусія» зрабіла сапраўдны подзвіг у другой сустрэчы з іспанскай «Малагай». Першы паядынак на Пірэнеях завяршыўся нулявой нічыёй, а вось у другой частцы супрацьстаяння, у прысутнасці 65 тысяч балельшчыкаў у Дортмундзе, наперад нечакана выйшлі пірэнейцы. Для «Малагі», якая за сваю 65-гадовую гісторыю нічога значнага не перамагла, гэта было жаданай казкай, марай, якая праіснавала 9 хвілін. Ужо ў дабаўлены час немцы спачатку зраўнялі лік, а пасля зрабілі яго пераможным — 3:2! Нечуваная прага да вікторыі! «Не магу апісаць таго, што я адчуваў, — прызнаўся шчаслівы Юрген Клоп па мянушцы «Клопа», галоўны трэнер «Барусіі». — Думаю, мне трэба ўбачыць урача». У выніку астатніх супрацьстаянняў далей прайшоў мадрыдскі «Рэал», які хоць саступіў стамбульскаму «Галатасараю» 2:3, але ў першай сустрэчы атрымаў больш упэўненую вікторыю 3:0. «Барселона» наогул трапіла далей нават без перамог: два матчы з французскім ПСЖ каталонцы завяршылі нічыёй (2:2, 1:1) і, дзякуючы больш рэзультатыўнай нічыі ў гасцях, прайшлі далей.



«Барусія» святкуе перамогу.

Цікава, што ў другой гульні «Барса» пабіла свой антырэкорд. Месі і кампанія нанесла толькі два трапныя ўдары па варотах французаў. Гэта горшы паказчык іспанскага гранда ў Лізе чэмпіёнаў за апошняе дзесяцігоддзе. Такім чынам, сённяшняе лёсаванне вызначыць пары камандаў, якія 23 і 24 красавіка правядуць першыя сустрэчы паўфіналаў.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Наўздагон

# «ВОСЬ ТАК ПРОСТА ПАДЫСЦІ ДА БАБРА НЕ РЫЗЫКНУ»

**Учора мы расказвалі жудасную гісторыю пра тое, як у Камянецкім раёне бабёр укусіў чалавека і той памёр ад страты крыві. Рыбакі, якія ўбачылі жывёліну на ўзбочыне дарогі, вырашылі сфатаграфавацца на памяць, і ў нейкі момант тая ўпілася аднаму з іх ззаду вышэй калена, пашкодзіўшы артэрыю сцягна... Выпадак неардынарны, таму мы звярнуліся па каментарый да навуковага супрацоўніка сектара паляўніцтвазнаўства і рэсурсаў паляўнічай фаўны навукова-практычнага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах» Яўгена ВАСТОКАВА. Суразмоўца піша кнігу пра баброў, больш за тры дзясяткі гадоў займаецца адловам і ўлікам гэтых жывёл.**

— Увесну бабрыныя сем'і дзеляцца і маладыя асобіны рассяляюцца па новых вадаёмах. Трэба ведаць, ці была паблізу якая-небудзь рэчка. Бо пры наяўнасці побач вады бабры ў выпадку небяспекі звычайна ў некалькі скачкоў імкнуцца нырнуць у яе. Такім чынам яны ратуюцца ад драпежнікаў, якія палююць на іх. На дарослых асобін могуць напасці ваўкі, рысі, паспрабаваць дабрацца ў хатцы да звера можа мядзведзь. На малых бабранят могуць спакусіцца лісы, драпежныя птушкі — совы і філіны, а таксама шчупакі і самы. Напэўна, жывёліна напала на чалавека ад безвыходнасці. Такім чынам абараняцца можа нават пацук, не кажучы пра больш буйнога звера, — расказаў Яўген Кіравіч. — Чалавек на зямлі са спіны можа прыціснуць гэтую непаваротлівую жывёліну з масіўнай шыяй. Я лаўлю баброў кожны год, але вось так проста падысці да звера не рызыкну. Былі выпадкі, калі ідзеш правяраць капкан — а таго няма. Бабёр сарве той капкан і разам з ім закруціцца ў траве. Ты брыдзеш па калена ў вадзе і адчуваеш, што звер знаходзіцца за спінай. Падыходзіш да яго з асцярогай.

Паведамлялася, што бабёр, які ўкусіў рыбака, — быў буйным, на выгляд, кілаграмаў пад 40. На гэта Яўген Кіравіч заўважыў, што ў літаратуры звычайна згадваюцца экзэмпляры пад 30 кілаграмаў. Вага некаторых дасягае і 36-37 кілаграмаў.

— Раней я браў з сабой бязмен на 23 кілаграмы, і ў палявых умовах пры ўзважванні заўсёды было перавышэнне гэтай лічбы. Наколькі, не скажу, бо бабра ж не будзеш узважваць па частках! Цяпер набыў бязмен на 60 кілаграмаў, але яшчэ не карыстаўся ім.

Навуковец заўважыў, што добра было б адшукаць таго самага бабра і адправіць на экспертызу яго галаву: праверыць, ці не хварэў ён на шаленства і ад чаго мог стаць агрэсіўным. Паколькі натуральныя ворагі бабра ў прыродзе — ваўкі, лісы, рысі, якія хварэюць на яго, менавіта ад гэтых драпежнікаў паранены бабёр мог заразіцца. Бо сама жывёла спажывае выключна раслінную ежу, нейкія часцінкі мяса могуць толькі выпадкова патрапіць да яе з асноўным кормам. Дарэчы, па гэтай прычыне прафілактыка шаленства сярод баброў немагчымая, у адрозненне ад драпежнікаў, якіх вакцынуюць праз мясныя прынады.

— Працэнт захварэўшых на шаленства баброў вельмі невялікі: рэгіструецца адзін-два выпадкі ў год. Прычым такое здараецца не кожны год запар. Падкрэсліваю, гэта выпадкі, якія рэгіструюцца. Колькі насамрэч іх, сказаць цяжка, паколькі захварэўшая асобіна можа памерці ў прыродзе і пра гэта не будзе вядома.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ЗАГІНУЛІ 15 ТЫСЯЧ КУРАНЯТ

**На Лідскай птушкафабрыцы ў вёсцы Дайнова, паводле папярэдняй ацэнкі, загінула 15 тысяч галоў на суму каля 600 мільёнаў рублёў, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Праводзіцца праверка. Згодна з інфармацыяй першага намесніка начальніка Лідскага РАУС Сяргея Сыцэвіча, пасля паведамлення ад адміністрацыі фабрыкі на месца выехалі супрацоўнікі міліцыі, МНС, санітарна-эпідэміялагічнай і ветэрынарнай службаў, Следчага камітэта. Паводле папярэдняй інфармацыі, птушкі загінулі ад асфіксіі, што наступіла ад удушэння чадным газам. Нядаўна на птушніку было ўстаноўлена новае ацяпляльнае абсталяванне, якое павінна было забяспечыць бесперабойны рэжым сістэмы вентыляцыі. Аднак гэтая сістэма па нейкіх прычынах адключылася на большы час, чым патрабуецца. Чаму? Адказ павінна даць комплексная экспертыза сістэмы электрасетак, якую праводзяць незалежныя спецыялісты-энергетыкі з розных арганізацый.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Тэма дня

# ВЯЛІКАЯ РОЗНІЦА

## ЎЗНІКАЕ ПАМІЖ ЗАЦВЕРДЖАНЫМІ ПРАГРАМАМІ І ІХ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕМ

**Як дзяржаўныя органы, прадпрыемствы і арганізацыі выконваюць патрабаванні прэзідэнцкай дырэктывы № 3 па эканоміі і беражлівасці? Гэтая тэма абмяркоўвалася на пасяджэнні калегіі КДК Гродзенскай вобласці з удзелам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандра ЯКАБСОНА, старшыні Гродзенскага аблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ, кіраўнікоў райвыканкамаў і буйнейшых прадпрыемстваў.**

## ЦАНА ПЫТАННЯ

Каб зразумець цану «энергазберагальнага» пытання, Аляксандр Якабсон прывёў наступныя лічбы. З-за невыканання шэрагу мерапрыемстваў абласной праграмы недалічыліся эканамічнага эфекту ў аб'ёме каля 67 тысяч тон умоўнага паліва. Гэта прыкладна 47 тысяч тон саляркі, якой тыдні на два хопіць усёй краіне для забеспячэння пасяўной кампаніі. Альбо вобласці — на ўсю сяўбу, ды яшчэ застанецца на ўборачную.

Выкананне мадэрнізацыі прадпрыемстваў стрымліваецца дэфіцытам сродкаў? Вядома, грошай заўсёды не хапае. Аднак Аляксандр Якабсон звярнуў увагу і на тое, што на 1 студзеня гэтага года ў інавацыйным фондзе аблвыканкама даволі значная сума знаходзілася... у свабодным астатку. Няма эфектыўных праектаў, на якія можна было накіраваць гэтыя грошы? І ў той жа час кантралёры выявілі выпадкі выкарыстання сродкаў інавацыйнага фонду (больш за 500 мільёнаў рублёў) на аднаўленне і набыццё камплектных частак для старога зношанага абсталявання, у якім не было неабходнасці (Іўеўскае, Воранаўскае, Роскае прадпрыемствы жыллёва-камунальнай гаспадаркі).

У сістэме ЖКГ выяўлена шмат фактаў звышнарматыўнага расходавання, страт паліўна-энергетычных рэсурсаў. Пры гэтым былі спробы перакласці ўласныя пралікі на сваіх спажыўцоў. А прадпрыемства «Гродзенская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка» ўмудрылася яшчэ і прыпісаць да фактычнага выканання заданняў па ўводзе жылля пасля капітальнага рамонту і цеплавой рэабілітацыі 11 тысяч квадратных метраў. Гэта тры дамы, адзін з якіх, дарэчы, знаходзіцца насупраць... будынка Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці.

Сёлета прадпрыемствамі вобласці для мадэрнізацыі вытворчасці заяўлена больш за 800 мільярдаў рублёў інвестыцый. Усё быццам нармальна: бізнес-планы абаронены. Аднак ці будуць улічаны пралікі папярэднікаў? Каб не паўтарыць, напрыклад, сумны вопыт арганізацыі вытворчасці па абароне ад карозіі металічных канструкцый метадам гарачага ацынкавання (на дзяржаўным прадпрыемстве «Конус» у Лідзе).

— Фармалізм на стадыі распрацоўкі бізнес-плана, недакладна праведзеныя маркетынгавыя даследаванні прывялі да таго, што завод, у які ўкладзена 200 мільярдаў рублёў дзяржаўных сродкаў, фактычна прастойвае. Цяпер трэба, як той казаў, усёй грамадой папраўляць там справы, — сказаў Аляксандр Якабсон.

## ПРАЛІК НА СТАРЦЕ

Альбо такая праблема. Адной з прычын стратнасці некаторых прадпрыемстваў будындустрыі сёння называюць лішак на рынку вырабаў з ячэістага бетону. Аднак яшчэ ў 2008-2009 гадах Камітэт дзяржкантролю прапанаваў Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва пралічыць патрэбы Беларусі і нашы экспартныя магчымасці ў сувязі з аналагічнымі вытворчасцямі ў Расіі і ва Украіне і не ўкараняць дадатковыя магутнасці па ячэістым бетоне. Не прыслухаліся. Цяпер жа Гродзенскі камбінат будаўнічых матэрыялаў і прадпрыемства «Смаргоньсілікатабетон» маюць хранічныя страты.

У начальніка ўпраўлення галін гаспадаркі і грашова-крэдытнай сферы Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Аляксандра Жылко ёсць сумненні і наконт эфектыўнасці ўкаранення ў ААТ «Мастоўдрэў» праекта па вытворчасці пліт МДФ. Ці пралічыў канцэрн «Беллеспапера» нашу патрэбу ў гэтай прадукцыі і ці пойдзе яна на экспарт пасля з'яўлення на рынку замежнага прадпрыемства «Кронаспан» у Смаргоні, якое будзе таксама вырабляць гэтыя пліты? Прычым хутчэй за маставчан па тэрмінах уводу вытворчасці і рэалізацыі тавару. А значыць, рынкі для апошніх будуць ужо занятыя.

## НЕ СКЛАЛІСЯ АДНОСІНЫ

Прыводзіліся на пасяджэнні калегіі і факты няўдалых кантрактаў па пастаўках замежнага абсталявання. Часам складваецца ўражанне, што для асобных кампаній мы як выпрабавальны палігон, зазначыў Аляксандр Якабсон. Напрыклад, прадпрыемства «Гроднаэнерга» вядзе судовую цяжбу з пастаўшчыкамі абсталявання расійскай вытворчасці для Лідскай ЦЭЦ. Затраты склалі 56 мільярдаў рублёў, аднак абсталяванне на працягу пяці гадоў не было ўведзена ў прамысловую эксплуатацыю, ды і цяпер часта выходзіць са строю. У выніку не атрымліваем вялізныя аб'ёмы электраэнергіі ўласнай вытворчасці.

Не склаліся ў «Гроднаэнерга» і партнёрскія адносіны з індыйскай кампаніяй па рэканструкцыі Гродзенскай ЦЭЦ-2 з уводам газатурбіннай устаноўкі. Па прычыне зрыву тэрмінаў дадатковыя затраты склалі 39 мільярдаў рублёў.

Нядобрасумленна павёў сябе і італьянскі пастаўшчык абсталявання для шклозавода «Нёман». Тэрміны ажыццяўлення праекта па арганізацыі вытворчасці шкловаты правалены, а рэспубліка, акрамя ўсяго, страціла валюты ў памеры 5,5 мільёна еўра.

— Калі заключаюцца здзелкі, то не заўсёды прапісваюцца, так бы мовіць, сродкі абароны на той выпадак, калі партнёр аказваецца ненадзейным. Мы шмат на гэтым страчваем, асабліва па пастаўках абсталявання. Трэба граматна складаць дагаворныя абавязацельствы, каб, дапусцім, пры невыкананні з боку пастаўшчыка пункта 1 дагавора адразу ўключаўся пункт 2, які б кампенсаваў спажыўцу страты. Гэтай юрыдычнай пісьменнасці, а часам і проста жадання, не хапае, — лічыць Аляксандр Якабсон.

## ЗАВЫШАНЫЯ ШТРАФЫ

У гэтай сувязі старшыня гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці Валерый Касцюкевіч звярнуў увагу на шматлікія факты (ужо нейкую сістэму), калі кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў заключаюць з пастаўшчыкамі прадукцыі ці выканаўцамі паслуг (як правіла, камерцыйнымі структурамі) дагаворы на ўмовах... завышаных штрафных санкцый. У выніку летась сельскагаспадарчыя прадпрыемствы вобласці (а па сутнасці — бюджэт, які аказвае значную дзяржаўную падтрымку аграрнікам) страцілі 26 мільярдаў рублёў. Падобная практыка, якая датычыцца аграрнага сектара не толькі Гродзеншчыны, працягваецца і сёлета *(гл. артыкул «Кабальны дагавор... па ўласным жаданні», «Звязда» за 23 сакавіка)*.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра папярэдзіў кіраўнікоў райвыканкамаў аб персанальнай адказнасці за падобныя дагаворы. Да гэтай праблемы падключыліся праваахоўныя органы, паведаміў пракурор Гродзенскай вобласці Віктар Марозаў.

Па выніках пасяджэння калегіі Камітэтам дзяржкантролю вобласці сумесна з аблвыканкамам будуць выпрацаваны даручэнні на адрас канкрэтных кіраўнікоў, а таксама прапановы па пытаннях, якія варта вырашыць на рэспубліканскім узроўні. У прыватнасці, трэба павялічваць выкарыстанне мясцовых відаў паліва, аднак цяпер праблематычна купіць айчынныя катлы. Акрамя таго, Сямён Шапіра лічыць, што дзеля энергазберажэння неабходна актыўна займацца ўстаноўкай тэрмарэгулявальнай апаратуры ў шматпавярховых дамах, а таксама святлодыёдных лямпаў на вуліцах. У Гродне гатовы паказаць у гэтым прыклад.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## НЯДЗЕЛЯ, 21 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.15 Камедыя «Гараж».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Арсенал.
**9.40, 0.20 Серыял «Вясковая камедыя».**
**10.45** Урачэбныя тайны.
**11.15** Кулінарная дыпламатыя.
**11.45** Нашы.
**12.10 Камедыя «Не можа быць!».**
**14.00** Eurovision.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Анімацыйны фільм «Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч».
**16.40** Заўтра — гэта мы!
**17.10** «Мая праўда». «ВІА ГРА».
**18.10** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**19.10 Меладрама «Рыта».**
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.30 Драма «Недатыкальныя».**

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20** «Смяшарыкі».
**9.35** «Бесталковыя нататкі».
**9.55** Пакуль усе дома.
**10.50** Фазэнда.
**11.25** «Брэйн-рынг».
**12.25** «Раманавы. Містыка царскай дынастыі».
**13.25 Камедыя «Апякун».**
**15.00** «Асяроддзе пражывання».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Форт Баярд».
**18.00 Маст. фільм «Мушкецёры».**
**20.00** Контуры.
**21.05** «Дыханне планеты».
**21.40** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.45 Камедыя «Гарачыя галовы-2».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.50** М/ф «Пеўнічак — залаты грабеньчык».
**8.00 Прыгоды «Капітан Схлусі-галава».**
**10.15** Пазакласная гадзіна.
**10.35** Тэлебарометр.
**10.40** Пра мастацтва.
**11.10 Трылер «Ван Хельсінг».**
**13.40 Камедыя «Пакроўскія вароты».**
**16.20** Футбол. Чэмпіянат свету 2014. Відэачасопіс.
**16.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. «Шахцёр» — «Дынама» (Мінск).
**19.15** Суперлато.
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**21.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ліверпуль» — «Чэлсі».
**23.40** Спорт-кадр.

### СТБ

**6.40 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».**
**8.20 Драма «Закаханыя».**
**10.00, 16.50** «Аўтапанарама».
**10.30** «Вялікае снеданне».
**11.10** «Тайны свету».
**12.10** «Добры дзень, доктар».
**12.45 Прыгоды «Гардэмарыны, наперад!», заключная серыя.**
**14.10** «Тэрыторыя памылак».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**17.20** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.50** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Драма «Галоўная вуліца».**
**22.30** «Пякельная кухня-2».
**23.50 Драма «Тэтра».**
**1.55** «Дурні, дарогі, грошы».

### МІР

**5.00** Дак. фільм «Дзяржаўны Эрмітаж».
**5.35** М/ф.
**7.35** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**7.50** М/с «Смяшарыкі».
**8.05** «Ведаем рускую».
**9.00, 15.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10** «Даведнік».
**9.35** «Ежа з Зіміным».
**10.05** «Нязоркавае дзяцінства».
**10.30, 23.45 Маст. фільм «Чандні».**
**13.50** Дак. фільм «У свеце мінулага».
**15.10** Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**15.50, 21.00 Серыял «Я сышчык».**
**20.00** «Разам».
**21.50 Маст. фільм «Ноч і горад».**

**3.05 Маст. фільм «Трактарысты».**

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.20, 19.00, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.40 «Сінематограф». Меладрама «Гром нябесны».**
**12.25 Прыгоды «Шаравая маланка».**
**14.45** «Кінаблакнот».
**15.00 Фільм-дзецям. Серыял «Камісар Рэкс».**
**16.40** «TUT woman tv».
**17.00** Ток-шоу «Бульбокс».
**17.30 Серыял «Эўрыка».**
**19.05 Камедыя «Выхадныя».**
**20.45** «Вечарніца».
